ISSN 2524-2369 (print)
ISSN 2524-2377 (online)

## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

*BELARUSIAN SCIENTISTS*

Паступіў у рэдакцыю 17.07.2017
Received 16.05.2017

# УЛАДЗІМІР ВАСІЛЬЕВІЧ ГНІЛАМЕДАЎ
## (Да 80-годдзя з дня нараджэння)



Самае асноўнае ў жыцці чалавека, напэўна, гэта знайсці сябе, сваё месца ў жыцці, сваё прызванне, свой «покліч лёсу і часу», каб мець магчымасць напоўніцу рэалізаваць сябе на карысць людзям, Бацькаўшчыне. І чалавеку, для таго каб адчуць, зведаць і рэалізаваць свае прыродныя задаткі і магчымасці, неабходна прарабіць велізарную ўнутрана-духоўную працу душы, розуму і сэрца.

Пошук карэнняў духоўнай біяграфіі чалавека звычайна знаходзіцца ў сферы як асабістага лёсу, жыццёвай памяці і вопыту, так і ў заглядванні ў прастору містычна-лёсавага збегу абставін касмічнага, гістарычнага, грамадскага і індывідуальнага характару індывіда.

Дасягнуўшы пэўных вяршынь сацыяльнага, прафесійнага і чалавечага поспеху і сталення, асоба тым не менш імкнецца як мага больш расшырыць далягляды свайго «першаместа» ў гэтым свеце, каб адчуць сваю пупавінную знітаванасць з лёсам сваіх продкаў, аднавяскоўцаў, калег па працы, соцыумам, нацыяй, чалавецтвам, каб больш арганічна ідэнтыфікаваць сябе ў свеце, часе і быцці, каб заставацца самім сабой і быць удзячнай людзям, якія сустрэліся на яе жыццёвым і культурным шляху самастанення.

Гэта ва ўсёй эстэтычнай паўнаце і змястоўнасці мы можам прачытаць і адчуць у цікавай, змястоўнай кнізе «Уладзімір Гніламедаў: Заставацца сабой» з серыі «*Асоба і час*», выдадзенай у 2012 годзе і прымеркаванай да 75-годдзя з дня нараджэння акадэміка НАН Беларусі Уладзіміра Васільевіча Гніламедава. Час бяжыць хутка, і сёлета мы ўжо адзначаем 80-гадовы юбілей слыннага навуказнаўцы і пісьменніка.

Асоба выдатнага айчыннага гуманітарыя-навукоўца, літаратуразнаўца, пісьменніка і крытыка, доктара філалагічных навук, прафесара, акадэміка, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі – Уладзіміра Васільевіча Гніламедава – займае сваё адметнае і пачэснае месца ў беларускім літаратурным тэзаўрусе XX і XXI стагоддзяў.

Добра вядома, што час і месца нараджэння чалавека прыдаюць асаблівы акрас і характар яго будучай біяграфіі. Па словах маці, час нараджэння будучага акадэміка супаў са святам каталіцкіх Каляд, але метрыка ў вайну згарэла, і камісія па ўстанаўленні ўзросту запісала дату нараджэння «па палітычных меркаваннях» – 26 снежня 1937 года. Месцам жа народзінаў стала паляшуцка-дулебская вёска Кругель, што ў дзесяці кіламетрах ад пасёлка Камянец, які гістарычна слаўны сваёй абарончай вежай-стаўпом.

З малых гадоў няўрымслівая і пазнавальная натура хлопчыка як магніт імкнулася прыцягнуць, увабраць і акумуляваць у сябе прыродна-гістарычную энергетыку роднага краю, а праз душэўную чуллівасць падлетка да магіі слова зведаць і спазнаць неабдымную прастору акаляючага свету і чалавека ў ім.

© Шаладонаў І. М., 2018

Закончыўшы з сярэбраным медалём мясцовую сярэднюю школу, малады апантаны юнак жадаў паступіць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на геалагічны факультэт. Аднак збег абставін склаўся так, што ён вымушаны быў здаць дакументы ў Брэсцкі педагагічны інстытут на філалагічны факультэт, дзе з захапленнем пачаў спазнаваць таямніцы мастацкага, вобразнага слова, разам з тым на ўсё жыццё захаваўшы ў сабе цікавасць да вандровак і падарожжаў.

Па заканчэнні інстытута ў 1959 годзе малады настаўнік нядоўгі час працуе на Берасцейшчыне завучам Тамашоўскага дзіцячага дома і па сумяшчальніцтву намеснікам дырэктара Камароўскай сярэдняй школы. Затым у 1959–1961 гадах ён праходзіць нялёгкую і напружаную салдацкую службу ў войсках супрацьпаветранай абароны. Менавіта на гэты час прыпадае знакаміты эпізод «халоднай вайны» са збітым амерыканскім самалётам-разведчыкам У-2 надалёка ад горада Свярдлоўска (зараз Екацярынбург).

Пасля сужбы ў арміі ў 1962 годзе прага да творчай літаратурай дзейнасці, трывала прывітая выкладчыкамі педінстытута, скіравала жыццёвую сцяжыну былога армейца ў аспірантуру Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Беларускай акадэміі навук. Тут, у сценах гэтага акадэмічнага Інстытута, і будуць у асноўным праходзіць жыццясталенне і жыццясцвярджэнне нашага юбіляра. Пасля паспяховага завяршэння навучання ў аспірантуры ён становіцца навуковым супрацоўнікам гэтага Інстытута, а ўжо ў 1966 годзе ім была абаронена кандыдацкая дысертацыя на тэму «Праблема традыцый і наватарства ў сучаснай беларускай лірыцы (1954–1965)».

Схільнасць маладога вучонага да цэласнага аналізу працэсу літаратурнага развіцця раскрыла ў ім задаткі дасціпнага і сур’ёзнага навукоўца, які імкнецца да шырокага ахопу як фактычнага матэрыялу, багатай паэтычнай і лірычнай спадчыны беларускай паэзіі, так і выдатна спалучае яго са скрупулёзным, аналітычным вопытам тэрэатычных распрацовак лепшых дасягненняў літаратуразнаўчай навукі. Усё гэта было заўважана старэйшымі таварышамі па працы, якія затым і рэкамендавалі маладога кандыдата навук на адказную партыйна-літаратурную працу.

З 1969 па 1976 год Уладзімір Васільевіч знаходзіцца на партыйнай рабоце, працуючы інструктарам ЦК КПБ па пытаннях літаратуры, прымае актыўны і непасрэдны ўдзел у вірлівай і вельмі далікатнай дзейнасці па фарміраванню рэспубліканскага літаратурнага працэсу і жыцця. Але прага і жаданне да самастоўнай рэалізацыі ў слове і літаратуры ніколі не пакідалі творчую натуру дзейснай і крэатыўнай асобы. І ў 1976 годзе па запрашэнню новага дырэктара Інстытута літаратуры І. Я. Навуменкі, які падбіраў сваю каманду для працы ў акадэмічным інстытуце, Уладзімір Васільевіч зноў вяртаецца ў родны для яго Інстытут літаратуры, на пасаду намесніка дырэктара Інстытута па навуковай працы, а з 1977 года па сумяшчальніцтву яшчэ становіцца і загадчыкам аддзела тэорыі літаратуры.

Уліўшыся ў творчую атмасферу ўжо добра сябе зарэкамендаваўшай акадэмічнай установы, дзе плённа і актыўна працавала цэлая плеяда таленавітых і знакамітых вучоных-літаратуразнаўцаў, такіх як А. Адамовіч, В. Івашын, В. Каваленка, П. Дзюбайла, М. Арочка, М. Мушынскі, В. Жураўлёў і іншыя, Уладзімір Васільевіч даволі хутка ўвайшоў у агульны напружаны рытм навукова-даследчага вывучэння тэорыі, гісторыі, паэтыкі і тэксталогіі айчыннай літаратуры. У 1987 годзе У. В. Гніламедаў паспяхова абраняе доктарскую дысертацыю на тэму «Сучасная беларуская паэзія: творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс» і праз чатыры гады атрымоўвае ганаровае званне прафесара.

З 1997 па 2006 год амаль цэлае дзесяцігоддзе яму давялося працаваць на пасадзе дырэктара адзінай у краіне акадэмічнай установы, якая займаецца шматаспектным даследаваннем праблем нацыянальнай і сусветнай літаратуры. Менавіта на гэты перыяд прыпадае праца і выданне Інстытутам літаратуры фундаментальнай навуковай працы «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя ў чатырох тамах і шасці кнігах» (1999–2014), якая сталася плёнам даследчыцка-навуковых дасягненняў лепшых літаратуразнаўчых сіл усёй Беларусі пад агульнай каардынацыяй і кіраўніцтвам Інстытута літаратуры. У гэтым маштабным даследаванні паказаны важнейшыя дасягненні нашага прыгожага пісьменства за апошняе стагоддзе свайго існавання, зроблена паспяховая аналітычная апрабацыя мастацкага тэзаўруса нашага пісьменства і літаратурнага працэсу. Між іншым такой абагульняючай і грунтоўнай працай пакуль не могуць пахваліцца нашы ўсходнеславянскія суседзі.

У 2003 годзе Уладзіміра Васільевіча абіраюць акадэмікам НАН Беларусі. На сучасны момант ён працуе на пасадзе галоўнага навуковага супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, куды на правах філіяла ўваходзіць і Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, адначасова займаючы пасаду Старшыні Савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый у галіне літаратуразнаўства. Ён з'яўляецца членам праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, а таксама членам рэдкалегіі многіх цэнтральных дзяржаўных выданняў у галіне культуры, мастацтва, мовы і літаратуры, такіх як часопісы «Полымя», «Белая вежа», «Роднае слова», «Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук» і інш. Нават цяжка пералічыць усе грамадскія і дзяржаўныя нагрузкі і пасады руплівага навукоўцы і грамадзяніна.

Друкавацца У. В. Гніламедаў пачаў з 1962 года. У сферы зацікаўленасці вучонага – шырокі спектр пытанняў тэорыі і гісторыі, паэтыкі і эстэтыкі, тэксталогіі і метадалогіі айчыннай і сусветнай літаратуры, а таксама майстэрства пісьменніцкага самавыяўлення.

З-пад яго пяра выйшлі навуковыя выданні: брашуры – «Лірычны летапіс часу» (1967), «Ленін у сэрцы» (1968), «Сучасная беларуская паэзія» (1969), «Пафас жыццясцвярджэння: Вобраз чалавека актыўнай жыццёвай пазіцыі ў сучаснай беларускай паэзіі» (1985), ён адзін з аўтараў кнігі «У. І. Ленін і Кастрычніцкая рэвалюцыя ў беларускай літаратуры» (у сааўтарстве з С. Лаўшуком і Л. Савік) (1987), аўтар манаграфій – «Традыцыі і наватарства» (1972), «Сучасная беларуская паэзія: Творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс» (1983), «Іван Мележ: Нарыс жыцця і творчасці» (1984), «Праўда зерня: творчы партрэт Васіля Зуёнка» (1992), «Янка Купала: Новы погляд» (1995), «Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію» (2001), «Янка Купала: Жыццё і творчасць» (2002); зборнікаў літаратурна-крытычных артыкулаў – «Упоравень з часам» (1976), «Як само жыццё» (1980), «Ля аднаго вогнішча» (1984), «Класікі і сучаснікі» (1987).

Усе гэтыя навуковыя манаграфічныя даследаванні ствараюць маштабную панараму літаратурнага і мастацкага працэсу, жыцця Айчыны, падаюць яго ў шырокіх і шматаспектных стасунках і ўзаемаадносінах нацыянальнай культуры з культурнай традыцыяй іншых народаў, з агульным гістарычным рухам і дасягненнямі сусветнага мастацтва.

Гэтыя працы – сапраўдны летапіс значных дасягненняў беларускай літаратуры ХХ стагоддзя, у якім за больш чым паўвекавы прамежак часу створана цэлая галерэя творчых партрэтаў класікаў нацыянальнай паэзіі і прозы Я. Купалы, Я. Коласа, А. Куляшова, М. Танка, І. Мележа, В. Зуёнка і многіх іншых выдатных, таленавітых творцаў беларускай і сусветнай літаратуры.

У апошнія два дзесяцігоддзі празаічная творчасць Уладзіміра Васільевіча сталася ўнікальнай літаратурна-мастацкай з'явай нашай літаратуры. У. В. Гніламедаў, амаль без папярэдняй стылістычнай падрыхтоўкі праз менш дробныя празаічныя формы апавядання і аповесці, адразу паспяхова рэалізаваў свой талент у аваладанні такім складаным і патрабуючым асаблівага мастацкага і эстэтычнага майтэрства, празаічным жанры, як раман, і вельмі хутка пры гэтым заняў у сучасным беларускім літаратурным працэсе прыкметнае і сталае месца.

Феномен яго пісьменніцкага самавыяўлення шмат у чым з'яўляецца праяўленнем неардынарнай прыроды таленту асобы юбіляра, амаль выключнай з'явы ў нашым пісьменстве. Мы амаль не знойдзем яшчэ аднаго такога прэцэдэнту ў айчыннай літаратуры, каб пісьменнік у сталым узросце так хутка, паўнакроўна і плённа мог увайсці ў прафесійны статус мастацкай рэалізацыі.

За адно дзесяцігоддзе У. Гніламедаў выдае эпапейную сямейную хроніку з шасці раманаў «Валошкі на мяжы» (2004), «Уліс з Прускі» (2006), «Расія» (2007), «Вяртанне» (2008), «Вайна» (2010), «Пасля вайны» (2014–2015) (у часопісным варыянце «Полымя» № 11, 12 за 2014 год і «Полымя» № 4, 5, 6 за 2015 год). Галоўнай дзеючай асобай эпапеі стаў беларускі селянін Лявон Кужаль, прататыпам якога з'яўляецца дзед героя нашага артыкула. У гэтай хранікальнай сямейнай раманнай эпапеі нацыянальнага быту і быцця беларуса паўднёва-заходняй часткі Беларусі выразна і яскрава выяўлены і зафіксаваны адзін з этнанацыянальных складнікаў ментальнасці і характару нашага народа, раскрыты шматаспектныя асаблівасці фарміравання гістарычнай і экзістэнцыяльнай еднасці людзей, іх саборнага спосабу выжывання ва ўмовах катастрафічных гістарычных падзей ХХ стагоддзя. Адзначым яшчэ тое, што ў гэтым годзе быў надрукаваны раман «Россия» ў перакладзе на рускую мову.

Усіх, хто добра ведае Уладзіміра Васільевіча, перш за ўсё ў ім уражвае і заварожвае моц яго энцыклапедычных ведаў, манера заўсёды паважнай, змястоўнай гутаркі з субяседнікам, неза-

лежна ад яго статусу, дзівіць характар яго маштабнага, стратэгічнага мыслення, якое змяшчае ў сабе адначасна незвычайную гібкасць, лабільнасць, пры наяўнасці незалежнага і грунтоўнага спосабу разумення ім тых ці іншых праблем, што дазваляе яму хутка схопліваць сутнасць навуковай і жыццёвай думкі і сітуацыі суразмоўцы і апанента, дзеля дапамогі ў прыняцці таго ці іншага важнага рашэння.

Ён вельмі чула і глыбінна разумее логіку развіцця гуманітарнай навукі, адчувае пульс сучаснага часу, цудоўна разбіраецца ў сістэме яго ўнутраных законаў, разумеючы, што навуцы і мастацтву патрэбна свабода думкі і самавыяўлення, сіла боскага натхнення, а залішні бюракратычны ўціск не можа ў поўнай меры спрыяць прафесійнаму росту і развіццю навукоўцаў.

Вось ужо амаль паўстагоддзя знаходзячыся на стырне літаратурнага працэсу краіны – працуючы ў высокіх партыйных органах, з’яўляючыся больш за дваццаць год намеснікам дыректара Інстытута літаратуры, а затым дзевяць год яго дырэктарам – Уладзімір Васільевіч з разуменнем ставіцца да жыццёвых і навуковых праблем супрацоўнікаў, падтрымлівае іх навуковыя ідэі і творчыя ініцыятывы, дапамагае маладым навукоўцам увайсці ў цікавы, але разам з тым такі глыбінны і складаны свет літаратуры. За свой літаратуразнаўчы куратарскі век ён падрыхтаваў каля 40 кандыдатаў і 4 дактароў філалагічных навук. Трэба адзначыць уласцівае яму ўнікальнае ўменне заспакоіць пачынаючага маладога навукоўца, добразычліва прыняць да сэрца яго клопаты і довады, шчыра ставіцца да яго ўнутранага, можа пакуль толькі эмацыянальнага, суб’ектыўна-наіўнага погляду на навуковую праблему, да яго, магчыма, не зусім слушных перакананняў, каб затым спакойна выказаць сваю думку, якую ты можаш узяць толькі на паверку, ужо зрабіўшы свой самастойны і абдуманы выбар.

Па сваёй натуры Уладзімір Васільевіч прыроджаны лідар, а як добра вядома, прызначэнне сапраўднага лідара быць правадніком Быцця ў свеце. Лідар мае магчымасць як ніхто іншы бачыць прысутнасць Быцця, адчуваць яго творчыя магчымасці. У гэтым, мабыць, і заключаецца выключная роля такіх людзей быць хвалююча неспакойным, будзіцелем, задаваць сабе і іншым цяжкія пытанні навукі і жыцця, шукаць адказ на іх у сваіх манаграфіях і мастацкіх творах у супрацоўніцтве з іншымі людзьмі. Я гэта выразна адчуў падчас свайго амаль трыццацігадовага ведання акадэміка і цеснага супрацоўніцтва з ім у час напісання сваёй навуковай працы. Вельмі сімптаматычным фактам з’яўляецца і тое, што родная дачка Уладзіміра Васільевіча Вольга Уладзіміраўна выбрала сабе жыццёвай сцяжынай таксама служэнне мастацкаму слову, яна паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю па літаратуразнаўству і зараз працуе ў ВНУ.

Адданая, руплівая і высокакваліфікаваная навуковая, творчая і кіраўніцка-настаўніцкая праца і дзейнасць Уладзіміра Васільевіча была заўважана грамадскасцю і ўладай і не раз удастоена ўвагі і пашаны. Ён з’яўляецца лаўрэатам Літаратурнай прэміі ў галіне крытыкі імя Уладзіміра Калесніка (1996), прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2005), Рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2006), узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны (2009) і медалямі. У сакавіку 2017 года рэктаратам роднага БрДУ Уладзіміру Васільевічу было нададзена званне Ганаровага доктара гэтай вышэйшай навучальнай установы.

Уладзімір Васільевіч і зараз працягвае вельмі актыўна і крэатыўна працаваць на ніве нацыянальнага мастацтва слова і культуралогіі. Гуманітарная грамадскасць краіны, сябры віншуюць свайго ганаровага калегу з нагоды яго слаўнага юбілею, жадаюць нашаму шаноўнаму патрыярху айчыннай літаратуразнаўчай навукі яшчэ доўгіх гадоў збору ўраджаю з навуковай і творчай працы, моцнага здароўя, сямейнай сімфоніі жыцця, каб мы, яго калегі і вучні, яшчэ доўгі час маглі наталяць свае душы цеплынёй яго чуйнага, сумленнага і добразычлівага сэрца.

*І. М. Шаладонаў*


**Информация об авторе**

*Шаладонов Игорь Михайлович* − старший научный сотрудник. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 200072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: shaladonov@tut.by

**Information about the author**

*Iqor M. Shaladonov* − Senior Scientific Researcher, Belarusian Culture, Lanquaqe and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surqanov Str., Bldq 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: shaladonov@tut.by